АКД

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

па рэестры № 158

# ЗБОР МАТЭРЫЯЛАЎ СЯМ'І БАГДАНОВІЧАЎ

**Фонд № 153**
**Вопіс № 1**

**1878 - 1968 гг.**

УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗБОР МАТЭРЫЯЛАЎ СЯМ'І БАГДАНОВІЧАЎ

ФОНД № 153

ВОПІС №1

1878 - 1968

МІНСК 2011

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 153**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧА МАКСІМА АДАМАВІЧА І ПРА ЯГО | 1 - 8 | 1 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧ МАРЫІ АПАНАСАЎНЫ (НАРОДЖ. МЯКОТА, МАЦІ) | 9 - 14 | 1-2 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧА АДАМА ЯГОРАВІЧА (У НЕКАТ. ДАК. ГЕОРГІЕВІЧА) (БАЦЬКІ) | | |
| 3.1. | РУКАПІСЫ А.Я. БАГДАНОВІЧА | 15 - 18 | 2 -3 |
| 3.2. | ПЕРАПІСКА А.Я. БАГДАНОВІЧА | 19 - 22 | 3 |
| 3.3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ А.Я. БАГДАНОВІЧА | 23 - 33 | 3 -4 |
| 3.4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. БАГДАНОВІЧА | | |
| 3.4.1. | ФАТАГРАФІІ А.Я.БАГДАНОВІЧА, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ І Ў ГРУПАХ | 34 - 41 | 4 - 5 |
| 3.4.2. | ФАТАГРАФІІ РОДНЫХ А.Я. БАГДАНОВІЧА | 42 - 47 | 5 |
| 3.4.3. | ФАТАГРАФІІ СВАЯКОЎ І ЗНАЁМЫХ А.Я. БАГДАНОВІЧА | 48 - 57 | 5 - 6 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧАЎ ВАДЗІМА АДАМАВІЧА, ЛЬВА АДАМАВІЧА (РОДНЫХ БРАТОЎ М.А. БАГДАНОВІЧА) | 58 - 61 | 6 - 7 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧАЎ АЛЯКСАНДРА АДАМАВІЧА І АЛЯКСЕЯ АДАМАВІЧА (ЗВОДНЫХ БРАТОЎ М.А. БАГДАНОВІЧА) | 62 - 65 | 7 |
| 6. | ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧА ПАЎЛА АДАМАВІЧА (ЗВОДНАГА БРАТА М.А. БАГДАНОВІЧА) | 66 - 71 | 7 |
| 7. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ РОДНЫХ М.А. БАГДАНОВІЧА | 72 - 88 | 8 - 9 |
| 7.1. | ФАТАГРАФІІ СЕКЯРЖЫЦКАЙ СЦЕПАНІДЫ АПАНАСАЎНЫ, ВАЛАСОВІЧ ГАННЫ АПАНАСАЎНЫ (НАРОДЖ. МЯКОТА) І ІХ ДЗЯЦЕЙ | 72 - 74 | 8 |
| 7.2. | ФАТАГРАФІІ ГАПАНОВІЧ МАГДАЛІНЫ ЯГОРАЎНЫ (НАРОДЖ. БАГДАНОВІЧ), ЯЕ ДЗЯЦЕЙ І ЎНУКАЎ | 75 - 81 | 8 |
| 7.3. | ФАТАГРАФІІ ГАЛАВАН МАРЫІ ЯГОРАЎНЫ (НАРОДЖ. БАГДАНОВІЧ), ЯЕ ДЗЯЦЕЙ І ЎНУКАЎ | 82 - 88 | 9 |
| 8. | ПЕРАЛІК МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ | | |

## Прадмова

**Багдановіч Максім Адамавіч** нарадзіўся 27.11. (09.12) 1891 у г. Мінску. У 1892 – 1896 гг. жыў з бацькамі ў г. Гродне, пасля смерці маці ў 1896 г., сям'я Багдановічаў пераязджае на сталае жыхарства ў г. Ніжні Ноўгарад. У 1901 г. сям'ю наведала хросная маці Максіма – Вольга Епіфанаўна Сёмава. Максім паказаў ей свае першыя вершы на беларускай мове. У 1902 г. ён паступае ў першы клас Ніжагародскай мужчынскай гімназіі. У 1907 г. дасылае ў газету "Наша Ніва" свой першы твор – лірычнае апавяданне "Музыка". У 1908 г. сям'я Багдановічаў пераязжае ў г. Яраслаўль. У 1909 г. былі надрукаваны першыя вершы "Над магілай" і "Прыдзе вясна" у газеце "Наша Ніва". У 1911 г. скончыў гімназію. Упершыню наведаў Беларусь. Быў у г. Вільні, дзе жыў у рэдакцыі газеты "Наша Ніва", потым 2 месяца правёў у фальварку Ракуцёўшчына (каля Маладзечна). У гэтым жа годзе паступае ў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй (Яраслаўль). У прэсе з'яўляюцца водгукі на яго творы (у тым ліку ў чэшскім друку). У 1913 г. у г. Вільні выдадзена адзіная прыжыццёвая кніга вершаў "Вянок". Максім шмат працуе, займаецца перакладамі твораў французскага паэта Поля Верлена на беларускую мову, піша артыкулы. У 1914 г. былі выдадзены асобныя брашуры "Братья-чехи", "Угорская Русь", і "Червонная Русь". Ён актыўна выступае ў рускім і ўкраінскім друку. У 1916 г. заканчвае ліцэй. Восенню пераязджае ў г. Мінск і працуе сакратаром у губернскім харчовым камітэце. Актыўна ўдзельнічае ў працы Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны. Піша баладу ў былінным стылі "Страцім-лебедзь", верш "Пагоня", апавяданне "Катыш", нарысы аб уражаннях ад леташняй паездкі ў Крым, распачынае працу над літаратурнай хрэстаматыяй для пачатковай школы. Здароўе паэта значна пагоршылася. У лютым месяцы яго пасылаюць на лячэнне ў Крым. У г. Ялце ён зноў пераглядае сваю кніжку "Вянок" і адбірае з яе вершы для наступных выданняў сваіх твораў. У апошнія дні жыцця Максім працуе над складаннем беларускага лемантара. 12 (25) мая 1917 г. памірае ад туберкулезу легкіх. Пахаваны ў г. Ялце на гарадскіх могілках.

**Багдановіч (народж. Мякота) Марыя Апанасаўна** нарадзілася 22.02.1869 г. у г. Ігумене (цяпер г. Чэрвень) у сям'і губернскага сакратара А.І. Мякоты. За ўдзел у Крымскай вайне ён атрымаў тытул двараніна. Пасля яго смерці ў 1879 г. трое з пяці дзяцей (Марыя, Аляксандра, Міхал) былі аддадзены ў Мінскі дзіцячы прытулак. Марыя Апанасаўна спадабалася папячыцельніцы прытулку жонцы губернатара Л.П. Пятровай, якая ўзяла яе да сябе ў дом і паслала вучыцца ў Мінскае жаночае Аляксандраўскае вучылішча, а пасля яго заканчэння ў 1886 г. у г. Санкт-Пецярбургскую земскую настаўніцкую школу. У кастрычніку 1888 г. Марыя Апанасаўна абвянчалася з А.Я. Багдановічам у Хмарына-Гарадзецкай царкве Мінскага павета. Вяртаецца ў г. Мінск так і не скончыўшы вучыцельскую школу. Яна нарадзіла трох сыноў – Вадзіма,

Максіма і Льва, а таксама дачку. Нараджэнне дачкі Ніны паспрыяла развіццю чахоткі. Марыя Апанасаўна памерла 4 красавіка 1896 г. у г. Гродна, дзе пахавана на праваслаўных могілках.

**Багдановіч Адам Ягоравіч** (Адольф Георгіевіч, Адам Юр'евіч, Адам Георгіевіч) нарадзіўся 25.03. (06.04) 1862 г. у мястэчку Халопенічы Бабруйскага павета (цяпер Крупскі раён Мінскай вобласці). Пачаў працаваць у 12-гадовым узросце ў мінскіх чыгуначных майстэрнях. Падчас навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1879 – 1882) арганізаваў гурток "Самаразвіцця і самаадукацыі". Быў напраўлены настаўнікам у вёску Пагарэлае Ігуменскага павета. У жніўні 1882 г. уступіў у "семінарскую" групу нарадавольцаў г.Мінска, на працягу 3-х гадоў вёў прапагандысцкую работу ў вёсках Ігуменскага павета. У 1885 – 1891 гг. ён загадчык 1-га гарадскога пачатковага вучылішча ў г. Мінску. Уваходзіў у кіруючы склад мінскай арганізацыі "Народная воля". Займаўся самаадукацыяй, вывучаў самастойна нямецкую, французскую, польскую, лацінскую, грэчаскую і старажытнаяўрэйскую мовы, што дапамагала яму ў навукова-асветніцкай дзейнасці. Пасля рэзкага пагаршэння здароўя адышоў ад рэвалюцыйнай дзейнасці. У 1892 г. пераехаў у г. Гродна, дзе пачаў працаваць памочнікам бухгалтара ў мясцовым аддзяленні Сялянскага пазямельнага банка. Адначасова, звыш 4 гадоў, быў дырэктарам Гродзенскай публічнай бібліятэкі. У лютым 1896 г. быў узнагароджаны срэбраным медалём (у памяць імператара Аляксандра III). У лістападзе 1896 г. пераехаў з сям'ёй ў г. Ніжні Ноўгарад, дзе працаваў бухгалтарам Ніжагародскага аддзялення Сялянскага пазямельнага банка, у ліпені 1897 г. узведзены ў чын калежскага рэгістратара (у 1897 – 1898 гг. быў адначасова загадчыкам Ніжагародскай грамадскай бібліятэкі). У красавіку 1900 г. атрымаў чын губернскага сакратара са старшынствам, у 1902 г. – неадменны член, з мая 1903 г. – калежскі сакратар са старшынствам. У 1905 г. узнагароджаны ордэнам св. Ганны 3 ступені. У лютым узведзены ў чын тытульнага саветніка са старшынствам. У кастрычніку 1907 г. пераведзены неадменным членам у Яраслаўскае аддзяленне таго ж банка і ўзнагароджаны ордэнам св. Станіслава 2 ступені. Пераезд у г. Яраслаўль адбыўся ў чэрвені 1908 г. У сакавіку 1909 г. узведзены ў чын калежскага асэсара са старшынствам, а з сакавіка 1913 г. – надворны саветнік са старшынствам. Вясной і летам 1916 г. Адам Ягоравіч працаваў у Таўрычанскім аддзяленні Сялянскага банка ў Крыму, куды перайшоў на працу, каб была магчымасць лячыць старшых сыноў. З верасня 1916 г. па сакавік 1917 г. зноў у Яраслаўлі. Тут яго застала лютаўская рэвалюцыя. Потым ён вяртаецца на працу ў Таўрычанскае аддзяленне банка. З ліпеня 1918 г. Адам Ягоравіч быў прызначаны кіраўніком Яраслаўскага аддзялення банка, дзе працаваў да яго ліквідацыі ў лютым 1920 г. У гэты ж час займаўся стварэннем двух саўгасаў для Цэнтрсаюза. Са снежня 1920 г. – ён загадчык навуковай бібліятэкі пры Яраслаўскім гістарычным музеі. Тут ён займаўся навуковым апісаннем старажытных рукапісаў, арганізаваў музей кнігі. Адначасова працаваў выкладчыкам у яраслаўскіх тэхнікумах – мастацка-

педагагічным (1921 – 1928), тэатральным (1922 – 1926) і музычным (1923 – 1926). Актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю. У лютым 1931 г. пайшоў на пенсію. Апошнія гады свайго жыцця прысвяціў навуковай працы (з 1922 г. – ён навуковы работнік ЦЕКУБУ, у 1925 – 1933 гг. – член бюро навуковых работнікаў). Памер А.Я. Багдановіч 16 красавіка 1940 г. у г. Яраслаўлі.

Навуковая дзейнасць А.Я. Багдановіча пачалася ў 1880 г., калі ў час сваіх вандровак па вёсках, ён пачаў запісываць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Яшчэ ў семінарскія гады А.Я. Багдановіч перадаў некаторыя свае фальклорныя запісы настаўніку П.А. Увядзенскаму, які супрацоўнічаў з вядомым фалькларыстам П.В. Шэйнам. Потым ён сам стаў карэспандэнтам – супрацоўнікам Шэйна, які надрукаваў у сваіх "Матэрыялах для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю"(т. 1-3, 1887 – 1902), зробленыя Адамам Ягоравічам запісы народных песень, казак, легенд, апісанне абрадаў беларускага вяселля і інш. За час жыцця ў Беларусі ім было апублікавана звыш 50 артыкулаў, грунтоўнае даследаванне "Пережитки древнего миросозерцания у белорусов (этнографический очерк)" (1895). Асноўная навуковая праца – "Этничный состав народов славянских и русских" (т. 1-2, 1935), якой спадарожнічалі даследаванні "Этнический состав белорусского народа", "Этнический состав населения Верхнего Поволжья, Оки и Камы". Вялікая навуковая праца "Язык земли. Образование водоречных названий и от них происходящих" (т.1-2, друкавалась фрагментарна, працаваў над ёй звыш 10 год). Было напісана шмат артыкулаў па аграрных пытаннях, праблемах народнай адукацыі, літаратуразнаўства, тэатральнага мастацтва. Талент вучонага і пісьменніка ў поўнай меры раскрыўся ў аўтабіяграфічных мемуарах, якія ён пачаў пісаць з 1934 г. і да канца жыцця. Выдатным мемуарным помнікам з'яўляюцца і ўспаміны пра А.М. Горкага (1928 – 1935). Ён аўтар прац "Рэвалюцыйны рух у г. Мінску і губерніі ў 80 і пачатку 90-х гг.", "Да гісторыі партыі "Народнай волі" ў г. Мінску і Беларусі, 1880 – 1882 гг.", "З мінулага мястэчка Халопенічы". Займаўся і мастацкімі перакладамі. Друкаваўся пад псеўданімамі А.Б., А. Б-ович, А. Б-вич, А. Борисовский, А. Гродненский.

А.Я. Багдановіч захаваў рукапісную спадчыну свайго сына Максіма, якую ў 1923 г. асабіста прывёз у г. Мінск і передаў у Інбелкульт. У 1927 – 1928 гг. быў выдадзены збор твораў Максіма Багдановіча ў 2-х тамах. Адам Ягоравіч напісаў каштоўныя ўспаміны пра сына – "Матэрыялы да біяграфіі Максіма Багдановіча" (1923 г., апублікаваны ў 1960 г.)[1].

**Багдановіч Вадзім Адамавіч** (06.03.1890 г., Мінск – 09.04.1908 г., Ніжні Ноўгарад). Вучыўся ў Ніжагародскай гімназіі. Вельмі актыўна паводзіў сябе падчас рэвалюцыі 1905-1906 гг., меў аратарскі талент і талент публіцыста (пра гэта пісаў бацька ў сваіх успамінах), збіраўся пісаць біяграфію вядомага рэвалюцыянера Г.А. Лапаціна. Памёр ад сухотаў.

[1] Архіў А.Я. Багдановіча захоўваецца ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча ў г. Мінску.

**Багдановіч Леў Адамавіч** (14.11.1893, Гродна – лета 1918, Кіеў). У 1912г. скончыў Яраслаўскую мужчынскую гімназію са срэбраным медалём. У 1912 – 1916 гг. – студэнт Імператарскага Маскоўскага ўніверсітэта матэматычнага аддзялення фізіка-матэматычнага факультэта, які не скончыў. Ішла Першая сусветная вайна. Ён меў адтэрміноўку па мабілізацыі з-за слабага здароўя. З лютага па май 1915 г. вучыўся на паскораных ваенных курсах у Александраўскім ваенным вучылішчы. Перад апошнім экзаменам у яго горлам пайшла кроў, і бацька адвёз яго ў г. Яраслаўль. Таму ў яго потым узніклі праблемы з афіцэрскім чынам. У 1916 г. служыў у запасе ўнтэр-афіцэрам, у студзені 1917 г. атрымаў званне прапаршчыка, а ў ліпені гэтага ж года ў першым сваім баі быў цяжка паранены разрыўной куляй у нагу. Амаль год ляжаў у кіеўскім шпіталі. 21 чэрвеня 1918 г. напісаў апошні ліст бацьку. Пад час чарговага перавароту Леў Адамавіч разам з іншымі хворымі афіцэрамі быў выкінуты праз вакно шпіталя. Пра гібель Льва Адамавіча стала вядома ад дзеншчыка, які прывёз яго асабістыя рэчы.

**Багдановіч Павел Адамавіч** (16.11.1901, Ніжні Ноўгарад – 06.11.1968, Яраслаўль) – зводны брат Максіма Адамавіча, сын А.Я. Багдановіча і Аляксандры Апанасаўны Мякоты (06.10.1874 – 1947). У 1912 – 1919 гг. вучыўся ў Яраслаўскай гімназіі імя Дз. Шчагалёва. З 1921 г. па 1923 г. – школьны работнік 1-й Савецкай школы 2-й ступені. У 1923 г. служыў у палітаддзеле 18-й Яраслаўскай стралковай дывізіі. У 1923 г. паступаў на матфак МГУ (але знікла частка яго дакументаў, таму яго не залічылі). З 1922 г. – кіраўнік фізіка-матэматычнай секцыі прыродазнаўчагістарычнага і краязнаўчага таварыства (з 1926 г. – член таварыства). У 1924 – 1925 гг. – студэнт Яраслаўскага педагагічнага інстытута. Вышэйшай адукацыі не атрымаў, займаўся самаадукацыяй. З 1931 г. па 1962 г. выкладчык матэматыкі Яраслаўскага энэрга-хімічнага рабфака (потым тэхнікума). Павел Адамавіч напісаў шмат метадычных работ па матэматыцы. У гады Вялікай Айчыннай вайны меў адтэрміноўку ад мабілізацыі па стану здароўя. У 1962 г. выйшаў на пенсію. У апошнія гады жыцця аслеп. З дапамогай родных вёў перапіску з даследчыкамі жыцця і творчасці брата Максіма. Бібліятэку бацькі перадаў у АН БССР, а сваю матэматычную бібліятэку – у БДУ ў 1965 г. Захаваны ім архіў і сямейныя рэліквіі паступілі ў архіў-музей пасля яго смерці.

Дакументы з сямейнага архіва Багдановічаў паступалі ў БДАМЛМ у 1968, 1969 гг. (прывозіў з г. Яраслаўля А.М. Бачыла ад удавы П.А. Багдановіча – Аўгусты Іванаўны), у 1973 г. паступілі ад Н.Б. Ватацы 3 копіі фатаграфій (групавая фатаграфія 7 яраслаўскіх гімназістаў ( у тым ліку М.Багдановіча), фота Г.Р. Какуевай і М.Я. Багдановіч) і апошняе паступленне ад В.М. Кузняцова (сына А.І. Багдановіч) у 1977 г. Гэтыя дакументы прывезлі з г.Яраслаўля супрацоўнікі архіва – загадчык аддзела камплектавання Г.Дз. Турко і старшы навуковы супрацоўнік Г.А. Ладзік. Былі прывезены разам з дакументамі асабістыя рэчы сям'і. Дакументы архіва былі апрацаваны ў 1970 г.

(воп. 1) і ў 1977 г. (воп. 2) старшым навуковым супрацоўнікам І.Дз. Пляскінай. У 2011 г. вопісы прайшлі ўдасканаленне. Былі адрэдагаваны і перакладзены на беларускую мову загалоўкі спраў, у магчымых выпадках зроблена анатаванне дакументаў і фатаграфій унутры спраў. Справы ў вопісах не перасістэматызаваліся і не перанумароўваліся. Напісаны біяграфічныя звесткі пра родных Максіма Адамавіча Багдановіча. У выніку удасканалення складзены вопіс №1 у колькасці 88 спраў (215 дакументаў) за 1878 – 1968 гг. Вопіс складаецца з 7 раздзелаў.

1. У раздзеле адсутнічаюць арыгінальныя дакументы Максіма Багдановіча – гэта толькі светакопія дзённіка паэта [1915], копіі яго фатаграфій (арыгіналы знаходзяцца ў справе №34 – сямейны альбом Багдановічаў). У асобных нумарах газеты "Савецкая Беларусь" (№134, 137) за 1923 г. змешчаны артыкулы і ўспаміны пра паэта за [1911] – 1925, 1951 гг.

2. Сярод дакументаў Марыі Апанасаўны – апавяданне "Накануне рождества", біяграфічныя дакументы – аб вучобе, вянчанні, смерці, копіі фатаграфій за 1882 – 1899 гг.

3. Раздзел мае 4 падраздзелы, куды ўвайшлі дакументы Адама Ягоравіча за 1878 – 1940 гг. 3.1 У падраздзеле змешчаны ўспаміны пра М.Горкага і Ф. Шаляпіна, яго аўтабіяграфія і пералік навуковых і літаратурных прац. 3.2 Невялікі падраздзел склалі 2 пісьма Адама Ягоравіча (чарнавікі); перадсмяротнае пісьмо сына Льва Адамавіча (21.06.1918), машынапісная копія пісьма А.М.Горкага да яго. 3.3 У падраздзеле па храналогіі змешчаны біяграфічныя дакументы – гэта пасведчанні аб жыхарстве, нараджэнні, хрышчэнні; з дазволам на ўступленне ў другі шлюб, рашэнне аб усынаўленні дзяцей, дакументы аб прызначэнні яму пенсіі, цікавыя дакументы - квіткі грашовых пераводаў А.Я. Багдановічу ад А.М. Горкага, К.П. Пешкавай і інш. (Горкі падтрымліваў свайго сябра матэрыяльна, каб ён змог займацца навуковай працай). 3.4 У падраздзел выяўленчых дакументаў увайшлі 3 тэматычныя групы. У першай – альбом з фатаграфіямі А.Я. Багдановіча, індывідуальнымі і з роднымі, фатаграфіі сыноў, родных, А.М. Горкага з жонкай (з дароўным надпісам) і інш. (сярод іх ёсць фатаграфіі з дароўнымі надпісамі ад розных асоб), яго фатаграфіі ў групах з А.П. Волжынай (другой жонкай), з вучнямі, супрацоўнікамі публічнай бібліятэкі ў г. Гродна, з А.М. Горкім і інш. – арыгіналы і копіі, партрэтная замалёўка Адама Ягоравіча, магчыма, зробленая сынам Аляксеем. У другой групе змешчаны фатаграфіі родных – бацькі, жонак і сясцёр. У трэцяй групе - фатаграфіі К.П.Пешкавай, А.М. Горкага і іх групавая фатаграфія (копіі), фатаграфія князя П.Д. Урус'ева (з дароўным надпісам) і інш. Храналагічныя рамкі падраздзела 1896 – [1930-я]гг. За падраздзелам змешчана справа з дакументамі Аляксандры Апанасаўны (трэццяй жонкі) - аб яе адукацыі, па пытанню ушчыльнення жылплошчы, дакументы А.Я. Багдановіча з рознымі яго запісамі і выпіскамі.

4. У раздзеле змешчаны некалькі спраў з дакументамі родных братоў Максіма Адамавіча – фатаграфія Вадзіма і яго сябра; пісьмо да Льва і яго фатаграфіі.

5. Раздзел склалі фатаграфіі Аляксандра (Шурыка) (1899 – 1904), сына Адама Ягоравіча і яго другой жонкі Аляксандры Паўлаўны. Пасля смерці маці, Шурыка выхоўвала жонка А.М. Горкага – Кацярына Паўлаўна і яе маці Марыя Аляксандраўна Волжына. Памёр ён ад дызентырыі. У гэтым жа раздзеле ёсць дакументы Аляксея Адамавіча (сына Адама Ягоравіча і Аляксандры Апанасаўны) (28.03.1905 – 1931), які быў мастаком. Сярод яго дакументаў - пейзаж, пасведчанне студэнта Яраслаўскага дзяржаўнага мастацкага тэхнікума (1922) і выпіскі з вершаў старажытных грэчаскіх паэтаў (па успамінах займаўся перакладамі).

6. У гэтым раздзеле сабраны дакументы Паўла Адамавіча, зводнага брата Максіма Адамавіча. Гэта біяграфічны артыкул пра бацьку напісаны з братам Мікалаем Адамавічам (01.12.1903 – 11.05.1965), пісьмы К.П. Пешкавай 14 (1940 – 1957), А.М. Іванова да Паўла Адамавіча і яго пісьмо да К.П. Пешкавай, фатаграфія Паўла Адамавіча ў дзяцінстве.

7. Раздзел складаюць тры тэматычныя падраздзелы, дзе змешчаны фатаграфіі родных цётак Максіма Адамавіча з іх дзецьмі і ўнукамі.

Стары вопіс змешчаны пад №88.

Прадмову склала
загадчык аддзела
02.03. 2011

Данекіна

В.Я.Данекіна

Выкарастаная літаратура:

1. Яцкевіч Зм. “Радавод Максіма Багдановіча”. Мн., “Беларускі кнігазбор”, 1999
2. Літаратурны музей Максіма Багдановіча. Архіўныя матэрыялы да жыцця і творчасці Максіма Багдановіча. Сшытак 2. Мн., 1997
3. Літаратурны музей Максіма Багдановіча. Зборнік дакладаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “І прад высокаю красою…” Мн., 2001

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК
ад 29.04. 2011 г.
№ 4

ФОНД № 153
ВОПІС № 1
за 1878 - 1968 гг.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧА МАКСІМА АДАМАВІЧА І ПРА ЯГО** | | | | |
| 1 | М.А.Багдановіч. Дзённік.<br>Святлакопія | [1915] | 13 | 1 | |
| 2 | З. Бядуля. "Мае ўспаміны (к вечару памяці М.Багдановіча)".<br>Я.Дыла. "Гарачае сэрца" (з жыцця М.Багдановіча), "Скарбы творчасці М.Багдановіча" (пад псеўд. Наз.Бываеўскі). Артыкулы.<br>Газета "Савецкая Беларусь" №134, 16.06.1923 | 1923 | 2 | 1 | АКД |
| 3 | А.Б. (А.А. Бабарэка) "Вечар памяці Максіма Багдановіча" (16 чэрвеня).<br>Нататка.<br>Газета "Савецкая Беларусь" № 137, 20.06.1923 | 1923 | 2 | 1 | АКД |
| 4 | Л. З-ц. (Л.Заяц). "Максім Багдановіч (Успаміны к 8 угодкам сьмерці)".<br>Святлакопія гранак газеты-аднадзёнкі "Іскра". Вільня. 31.05.1925 г. | 1925 | 2 | 1 | АКД |
| 5 | С.Г. Шумаковіч. "Невядомыя тэксты твораў Максіма Багдановіча". Нататка з дароўным надпісам С.Г. Шумаковіча П.А. Багдановічу ад 10.01.1951 г.<br>Выразка з газеты "ЛіМ" №15, 08.04.1950 | 1951 | 1 | 1 | АКД |
| 6 | Фатаграфіі М.А. Багдановіча. г. Яраслаўль.<br>Копіі | [1911, 1913] | 2 | 2 | |
| 7 | Нявызначаны мастак. Фатаграфія партрэта М.А. Багдановіча | [1915] | 1 | 1 | |
| 8 | Фатаграфія Багдановічаў Вадзіма і Максіма ў дзяцінстве. г. Гродна.<br>Копія | 1893 | 1 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧ МАРЫІ АПАНАСАЎНЫ (НАРОДЖ. МЯКОТА, МАЦІ)** | | | | |
| 9 | М.Б. ( М.А. Багдановіч). "Накануне Рождества". | | 2 | 1 | АКД |

90об



| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Каляднае апавяданне.<br>Газета "Гродненскія губернскія вѣдомости. Неоффиціальная часть". №102, 29.12.1893 г. | | | | |
| 10 | Пасведчанне Мінскага 3-х класнага жаночага вучылішча на імя М.А. Мякоты аб яго заканчэнні.<br>Фотакопія | 1882 | 1 | 1 | АКД |
| 11 | Дакументы М.А.Мякоты: аб вучобе ў Санкт - Пецярбургскай земскай вучыцельскай школе (пасведчанні вучаніцы 2 і 3 класа аб свабодным пражыванні ў горадзе); білет Мінскага паліцэйскага ўпраўлення з дазволам пражывання ва ўсіх гарадах Расійскай імперыі.<br>На адв. л 3 - пасведчанне аб вянчанні М.А. Мякоты з А.Я. Багдановічам у прыходскай Хмарына-Гарадзецкай царкве Мінскага павета 30.10.1888 г. | 1887 - 1888 | 4 | 4 | АКД |
| 12 | Пасведчанне Гродзенскага Сафійскага сабора аб смерці М.А. Багдановіч 04.10.1896 г., выдадзенае А.Я. Багдановічу.<br>Копія, завераная Ніжагародскім аддзяленнем Сялянскага пазямельнага банка. 13.01.1899 г. | 1899 | 1 | 1 | АКД |
| 13 | Фатаграфіі М.А. Багдановіч. гг. Мінск, Гродна.<br>Копіі | [1892 - 1893, 1896] | 2 | 2 | |
| 14 | Фатаграфіі М.А. Багдановіч з сынамі Вадзімам і Максімам. гг. Мінск, Гродна.<br>Копіі | [1891, 1892] | 2 | 2 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧА АДАМА ЯГОРАВІЧА (У НЕКАТ. ДАК. ГЕОРГІЕВІЧА) (БАЦЬКІ)** | | | | |
| | **3.1. РУКАПІСЫ А.Я. БАГДАНОВІЧА** | | | | |
| 15 | А.Я. Багдановіч "М. Горький и Ф.И. Шаляпин в Нижнем. (Отрывок воспоминаний)".<br>Машынапіс<br>Гл. таксама воп. 2, спр. 89 | [1928 - 1935] | 8 | 1 | АКД |
| 16 | А.Я. Багдановіч. "В последние годы (странички из жизни А.М.Горького)".<br>Машынапіс | [1928 - 1935] | 9 | 1 | АКД |
| 17 | А.Я. Багдановіч. Аўтабіяграфія. Напісана для Рыбінскага навуковага таварыства. | 1927 | 8 | 1 | АКД |

10

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Аўтограф | | | | |
| 18 | Пералік навуковых і літаратурных прац А.Я. Багдановіча.<br>Машынапіс | 1927 | 8 | 1 | АКД |
| | **3.2 ПЕРАПІСКА А.Я. БАГДАНОВІЧА** | | | | |
| 19 | Пісьмо А.Я. Багдановіча да Н.М. Шчарбаковай.<br>Чарнавік | 28.10.1932 | 2 | 1 | АКД |
| 20 | Пісьмо А.Я. Багдановіча ў прэзідыум Беларускай акадэміі навук па пытанню выплаты ганарараў за творы М.А. Багдановіча.<br>Чарнавік | [1928] | 2 | 1 | АКД |
| | *** | | | | |
| 21 | Пісьмо Л.А. Багдановіча (сына) да А.Я. Багдановіча.<br>Тэлеграма ад Гапановіч. Кіеў.<br>Гл. таксама воп 2, спр. 1 | 21.06.1918 | 4 | 2 | АКД |
| 22 | Пісьмо А.М. Пешкава (М. Горкага) да А.Я. Багдановіча.<br>Машынапісная копія | 29.06.1931 | 1 | 1 | АКД |
| | **3.3 ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ А.Я. БАГДАНОВІЧА** | | | | |
| 23 | Пасведчанне Халопенічскага валаснога праўлення 2-га Міравога ўчастка Барысаўскага павета на імя А.Г. Багдановіча (А.Я.) аб месцы яго жыхарства для паступлення ў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю | 06.08.1878 | 1 | 1 | АКД |
| 24 | Прадпісанне Мінскай дырэкцыі народных вучылішчаў Віленскай вучэбнай акругі А.Я. Багдановічу аб назначэнні яго выконваючым пасаду настаўніка 1-га Мінскага прыходскага вучылішча | 15.10.1886 | 1 | 1 | АКД |
| 25 | Пасведчанне Мінскай духоўнай кансісторыі "Аб нараджэнні і хрышчэнні Багдановіча Адама Георгія" 20.03.1862 г.<br>Арыгінал і натарыяльная копія | 1879, 1899 | 3 | 2 | АКД |
| 26 | Пасведчанне Сялянскага пазямельнага банка Санкт - Пецярбурга, выдадзенае бухгалтару Ніжагародскага аддзялення банка А.Г. Багдановічу | 20.01.1899 | 1 | 1 | АКД |

10об.



| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | з дазволам на ўступленне ў другі шлюб з дваранкай А.П. Волжынай | | | | |
| 27 | Метрычная выпіска Ніжагародскай бальнічнай царквы "Аб смерці жонкі чыноўніка А.П. Багдановіч" 15.11.1899 г. | 06.02.1902 | 2 | 1 | АКД |
| 28 | Рашэнне Яраслаўскага акруговага суда аб усынаўленні надворным саветнікам А.Г. Багдановічам дзяцей, народжаных А.А. Мякотай. Натарыяльная копія | 17.07.1915 | 2 | 1 | АКД |
| 29 | Ахоўная грамата Паўнамоцнага прадстаўніцтва БССР у РСФСР з суправаджальным пісьмом А.Г. Багдановічу ў сувязі з пераездам на пастаяннае месца жыхарства ў г. Мінск | 12.05.1923 | 2 | 2 | АКД |
| 30 | Заявы А.Г. Багдановіча ў розныя ўстановы наконт павелічэння памераў пенсіі | 06.09.1927 - 16.02.1940 | 8 | 8 | АКД |
| 31 | Дакументы А.Я. Багдановіча аб прызначэнні яму персанальнай пенсіі. Квітанцыя ашчаднай касы г. Яраслаўля аб атрыманні ад А.А. Багдановіч пенсійнай кніжкі А.Я. Багдановіча 24. 07. 1940 г. л.5 | 1928 - 1931 | 5 | 5 | АКД |
| 32 | Квіткі грашовых пераводаў А.Я. Багдановічу ад А.М. Горкага, К.П. Пешкавай, часопісаў "Литературное наследство", "Наши достижения", выдавецтваў і інш. | 1931 - 1939 | 25 | 25 | АКД |
| 33 | Заявы А.Г. Багдановіча ў бюро секцыі навуковых работнікаў "ИПО" і Яраслаўскую гарадскую міліцыю ў сувязі з крадзяжом у цягніку яго дакументаў і грошай | 18.10.1935 | 2 | 2 | АКД |
| | **3.4 ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ А.Я. БАГДАНОВІЧА** | | | | |
| | **3.4.1 ФАТАГРАФІІ А.Я.БАГДАНОВІЧА, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ І Ў ГРУПАХ** | | | | |
| 34 | Альбом А.Я. Багдановіча з фатаграфіямі родных, сваякоў, сяброў | 1896 - 1908, [1930-я гг.] | 49 | 1 | АКД |
| 35 | Фатаграфіі А.Я. Багдановіча, індывідуальныя. Арыгінал і копія | 1891, [1899 - 1900] | 2 | 2 | АКД |
| 36 | Неўстаноўлены мастак. Партрэтная замалёўка А.Я. | 1926 | 1 | 1 | АКД |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Багдановіча.<br>Папера, аловак | | | | |
| 37 | Фатаграфіі А.Я. Багдановіча, індывідуальныя. Яраслаўль.<br>Арыгіналы і копіі | [1920-я - 1930-я гг.] | 4 | 4 | АКД |
| 38 | Фатаграфіі А.Я. Багдановіча з А.П. Багдановіч (народж. Волжынай). Ніжні Ноўгарад.<br>Арыгіналы і копіі | [1899] | 4 | 4 | АКД |
| 39 | Фатаграфія А.Я. Багдановіча ў группе з вучнямі і настаўнікамі 1-га Мінскага прыходскага вучылішча.<br>Копія | [1890-1891] | 1 | 1 | |
| 40 | Фатаграфіі А.Я.Багдановіча з супрацоўнікамі публічнай бібліятэкі ў Гродна, з дзецьмі і інш. у г. Яраслаўлі | [1892 -1896], [1920-я гг.] | 3 | 3 | АКД |
| 41 | Фатаграфія А.Я. Багдановіча з А.М. Горкім, С.В. Шчарбаковым. г. Ніжні Ноўгарад.<br>Копія | [пач. 1900-х гг.] | 1 | 1 | |
| | **3.4.2 . ФАТАГРАФІІ РОДНЫХ А.Я. БАГДАНОВІЧА** | | | | |
| 42 | Фатаграфіі А.А. Багдановіч ( трэццяй жонкі), індывідуальныя. Мінск, Ніжні Ноўгарад.<br>Копіі | [кан. 1890-х - пач. 1900-х гг.] | 4 | 4 | |
| 43 | Фатаграфіі А.А. Багдановіч з сынам Раманам. Сімферопаль.<br>Арыгіналы і копія | 1916 | 3 | 3 | |
| 44 | Фатаграфія Я.Л. Багдановіча-Скокліча (бацькі) | [1860-я гг.] | 1 | 1 | |
| 45 | Фатаграфія Я.Л. Багдановіча-Скокліча з другой жонкай.<br>Копія | [1880-я гг.] | 1 | 1 | |
| 46 | Фатаграфіі А.П. Волжынай (другой жонкі), індывідуальныя.<br>Копіі | [1896, 1897] | 2 | 2 | |
| 47 | Фатаграфія сясцёр А.Я. Багдановіча - Магдаліны, Марыіі, Паўлы. Мінск.<br>Копія | [1880-я гг.] | 1 | 1 | |
| | **3.4.3 , ФАТАГРАФІІ СВАЯКОЎ І ЗНАЁМЫХ А.Я. БАГДАНОВІЧА** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 48 | Фатаграфіі К.П. Пешкавай (жонкі А.М. Горкага), індывідуальныя.<br>Копіі | [1890-я гг.] | 3 | 3 | |
| 49 | Фатаграфія А.М. Горкага з К.П. Пешкавай.<br>Копія | 1897 | 1 | 1 | |
| 50 | Фатаграфія А.М. Горкага, індывідуальная. Самара | [1895] | 1 | 1 | АКД |
| 51 | Фатаграфія князя П.Д. Урус'ева з дароўным надпісам А.Я. Багдановічу ад 09.09. 1902 г. Ніжні Ноўгарад | | 1 | 1 | АКД |
| 52 | Фатаграфіі З. Знаменскай з дачкой, з яе дароўным надпісам А.Я. Багдановічу ад 09.09.1919 г., Яраслаўль, М. Семакінай з яе аўтографам. 1908 г. | | 2 | 2 | АКД |
| 53 | Фатаграфія неўстаноўленай жанчыны. Пінск. | [1900- я гг.] | 1 | 1 | АКД |
| 54 | Фатаграфіі М.А. Волжынай з унукамі Максімам Пешкавым і Аляксандрам Багдановічам. Ніжні Ноўгарад.<br>Арыгінал і копія | [1901] | 2 | 2 | АКД |
| 55 | Фатаграфія С.В. Шчарбакова, дырэктара Ніжагародскай гімназіі, сябра А.Я. Багдновіча і М.Горкага.<br>Копія | [пач. 1900-х гг.] | 1 | 1 | |
| 56 | Фатаграфіі М.А. Волжынай, С.А. Мякоты (Секяржыцкай), немаўляткі М.А. Пешкава і неўстаноўленых асоб.<br>Арыгіналы і копіі | [1870-я] - 1909 | 12 | 12 | АКД |
| | * * * | | | | |
| 57 | Дакументы А.А. Багдановіч (народж. Мякота) (пасведчанне аб атрыманні адукацыі ў Мінскім дзіцячым прытулку, папярэджанне аб магчымым ушчыльненні жылой плошчы).<br>Дакументы А.Я. Багдановіча (запісы аб атрыманні грошай за творы сына і свае, пра рукапісы, якія патрэбны для працы; выразка з газеты пра М.Ф. Фраленка "На славном посту", выпіскі з цыркуляраў Маскоўскай, Каўказскай вучэбных акруг аб "Праве на производство в первый класный чин без испытания").<br>Гл. таксама воп. 2, спр. 25 | 1889 - 1940 | 7 | 7 | АКД |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **4. ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧАЎ ВАДЗІМА АДАМАВІЧА, ЛЬВА АДАМАВІЧА (РОДНЫХ БРАТОЎ М.А. БАГДАНОВІЧА)** | | | | |
| 58 | Пісьмо А.І. Гапановіч да Л.А. Багдановіча | 29.10.1912 | 1 | 1 | АКД |
| 59 | Фатаграфіі Л.А. Багдановіча, індывідуальныя. Арыгіналы і копіі | [1910], 1917 | 5 | 5 | АКД |
| 60 | Фатаграфія В.А. Багдановіча, індывідуальная. Копія | [1906 - 1907] | 1 | 1 | |
| 61 | Фатаграфія С.Гарбачыка (сябра В.А. Багдановіча) з дароўным надпісам свайму брату | [да 1908] | 1 | 1 | АКД |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧАЎ АЛЯКСАНДРА АДАМАВІЧА І АЛЯКСЕЯ АДАМАВІЧА (ЗВОДНЫХ БРАТОЎ М.А. БАГДАНОВІЧА)** | | | | |
| 62 | А.А. Багдановіч. Пейзаж. Кардон, алей | [1920-я гг.] | 1 | 1 | АКД |
| 63 | Выпіскі з вершаў старажытных грэчаскіх паэтаў. Рукапіс А.А. Багдановіча | [1920-я гг.] | 1 | 1 | АКД |
| 64 | Пасведчанне Яраслаўскага дзяржаўнага мастацкага тэхнікума на імя Багдановіча Аляксея Адамавіча | 10.05.1922 | 1 | 1 | АКД |
| 65 | Фатаграфіі Багдановіча Аляксандра Адамовіча (сына А.Я. і А.П.) | [1900, 1902] | 2 | 2 | АКД |
| | **6. ДАКУМЕНТЫ БАГДАНОВІЧА ПАЎЛА АДАМАВІЧА (ЗВОДНАГА БРАТА М.А. БАГДАНОВІЧА)** | | | | |
| 66 | П.А. і Мік.А. Багдановічы. "Адам Егорович Багданович". Артыкул. Аўтограф П.А. Багдановіча, аўтарызаваны Мік.А. Багдановічам машынапіс | [1950] | 30 | 2 | АКД |
| 67 | Пісьмы К.П. Пешкавай да П.А. Багдановіча | 1940 - 1949 | 9 | 5 | АКД |
| 68 | Пісьмы і тэлеграмы К.П. Пешкавай да П.А. Багдановіча | [1940], 1950 - 1957 | 9 | 9 | АКД |
| 69 | Пісьмо А.М. Іванова да П.А. Багдановіча. г. Яраслаўль | 12.03.1965 | 1 | 1 | |
| 70 | Пісьмо П.А. Багдановіча да К.П. Пешкавай. | 1950 | 2 | 1 | АКД |

12об.



| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Чарнавік | | | | |
| 71 | Фатаграфія П.А. Багдановіча, індывідуальная. Копія | [1904] | 1 | 1 | |
| | **7. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ РОДНЫХ М.А. БАГДАНОВІЧА** | | | | |
| | **7.1. ФАТАГРАФІІ СЕКЯРЖЫЦКАЙ СЦЕПАНІДЫ АПАНАСАЎНЫ, ВАЛАСОВІЧ ГАННЫ АПАНАСАЎНЫ (НАРОДЖ. МЯКОТА) І ІХ ДЗЯЦЕЙ** | | | | |
| 72 | Фатаграфіі С.А. Секяржыцкай (Мякоты) і яе сыноў Аляксандра, Уладзіміра і Яўгена. Дароўны надпіс Я.Ф. Секяржыцкага цётцы [А.А. Багдановіч] ад 06.06.1909 г. л. 1 Арыгіналы і копіі | [1909 - 1910-я гг.] | 4 | 4 | |
| 73 | Фатаграфіі Г.А. Валасовіч (Мякоты) з К.І. Валасовічам (мужам), Г.К. Гразновай (дачкой), П.І. Гразновым (мужам дачкі), Т.П. Гразновай (унучкай) і інш. Мінск, Ніжні Ноўгарад, Уладзімір, Горкі | 1915 - 1968 | 5 | 5 | АКД |
| 74 | Фатаграфіі Г.К. Валасовіч (па мужу Гразновай) з яе дароўнымі надпісамі А.Я. Багдановічу ад 29.05. і 06.06.1923 г. | | 2 | 2 | АКД |
| | **7.2. ФАТАГРАФІІ ГАПАНОВІЧ МАГДАЛІНЫ ЯГОРАЎНЫ (НАРОДЖ. БАГДАНОВІЧ), ЯЕ ДЗЯЦЕЙ І ЎНУКАЎ** | | | | |
| 75 | Фатаграфіі В.І. Гапановіч (па мужу Кунцэвіч), індывідуальныя (у дзяцінстве) і з дачкой Наталляй. Мінск | [1888 - 1914] | 4 | 4 | АКД |
| 76 | Фатаграфіі Гапановічаў Паўла Іванавіча і Пятра Іванавіча (сыноў М.Я. Гапановіча), індывідуальныя. Мінск | 1893 - 1915 | 3 | 3 | АКД |
| 77 | Фатаграфіі М.Я. Гапановіч (Багдановіч), індывідуальныя. Мінск, Ніжні Ноўгарад. Дароўны надпіс М.Я. Гапановіч Багдановіч Марыі Апанасаўне ад 1894 г. л.1 | 1894 - [1910-я гг.] | 5 | 5 | АКД |
| 78 | Фатаграфіі Г.І. Гапановіч (дачкі М.Я. Гапановіч), індывідуальныя і ў групе. Арыгінал і копіі | [кан. 1890-х гг.] - 1937 | 3 | 3 | АКД |
| 79 | Фатаграфіі К.Я. Селіваноўскай, індывідуальныя і разам з А.Г. і Т.Г. Кунцэвічамі (унучкамі М.Я. | 1919, 1932 | 4 | 4 | АКД |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Колькасць лістоў | Колькасць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Гапановіч). Ніжні Ноўгарад. З дароўнымі надпісамі К.Я. Селівяноўскай А.Я. Багдановічу ад 30.09.1932 г. | | | | |
| 80 | Фатаграфіі Н.Г., Т.Г. і Н.Г. Кунцэвічаў (унучак М.Я. Гапановіч). Ніжні Ноўгарад. З дароўнымі надпісамі А.Я. Багдановічу ад 18, 30.09.1932 г. | 1915, 1932 | 4 | 4 | АКД |
| 81 | Фатаграфія І.С. Гапановіча (мужа). Мінск | [1910-я гг.] | 1 | 1 | АКД |
| | **7.3. ФАТАГРАФІІ ГАЛАВАН МАРЫІ ЯГОРАЎНЫ (НАРОДЖ. БАГДАНОВІЧ), ЯЕ ДЗЯЦЕЙ І ЎНУКАЎ** | | | | |
| 82 | Фатаграфіі А.Т. і А.І. Галаванаў (сына і нявесткі М.Я. Галаван), індывідуальныя. Масква | [1950-я гг.] | 3 | 3 | |
| 83 | Групавыя фатаграфіі А.Т., Б.Т., Г.Т. і М.Т. Галаванаў (дзяцей М.Я. Галаван). Ніжні Ноўгарад | [1904 - 1910-я гг.] | 2 | 2 | АКД |
| 84 | Фатаграфіі А.А. і У.А. Галаванаў (унукаў М.Я. Галаван), індывідуальныя Арыгінал і копія | [1940-я гг.] | 2 | 2 | |
| 85 | Фатаграфія М.Я. Багдановіч (па мужу Галаван) з сяброўкай. Мозыр | [1887 - 1890] | 1 | 1 | АКД |
| 86 | Фатаграфіі М.Т. Галаван ( дачкі М.Я. Галаван). Ніжні Ноўгарад | [1906] | 1 | 1 | АКД |
| 87 | Фатаграфіі Н.А. Галаван (унучкі М.Я. Галаван), індывідуальныя | [1930-я гг.] | 3 | 3 | АКД |
| 88 | "Собрание материалов семьи Богдановичей". Вопіс №1 за 1878 - 1968 гг. | 1970 | 16 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 88 (восемдзесят восем)
спраў з № 1 па № 88 , 218 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

загадчык аддзела [подпіс] В.Я. Данекіна

22.02.2011

Дакументы прынялі:

загадчык аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў [подпіс] В.І. Бярэйшык

"24" 05 2011 г.

Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства

# ФОНД № 153

# ПЕРЕЧЕНЬ МУЗЕЙНЫХ ПРЕДМЕТОВ

УТВЕРЖДЕНО
Протокол ЭМК
От 29.12.1977

ФОНД № 153

| № п/п | Инвен-тарный № | Название, короткое описание предмета | Дата создания | Описание внешних особенностей, степени сохранности, размеры | Приме-чание |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1. | 42 | Репродукция гравюры Фрошла "Мадонна" | | требует реставрации, 48,5 х 63 см. | |
| 2. | 43 | Металлическое блюдо овальной формы, мельхиоровое, на обратной стороне торговая марка "Fraget plaque MB" | 1912 г. | состояние удовлетворительное, 42 х 20 см. | |
| 3. | 44 | Фарфоровое блюдо овальной формы, по краям тиснёный узор и роспись в виде букетов ромашек. На обратной стороне торговая марка "VILLEPOY and BOSH /METTLACH" | | разбито на 2 части, пожелтело | |
| 4. | 45 | Кофеварка с крышкой | | помята, края крышки выщерблены | |
| 5. | 46 | Горшок глиняный для выпечки пасхальной сдобы | | состояние удовлетворительное | |
| 6. | 47 | Столовая ложка с узорами на ручке | | состояние удовлетворительное, присутствуют царапины | |
| 7. | 48 | Столовая ложка с узорами на ручке | | состояние удовлетворительное | |
| 8. | 49 | Столовая ложка с узорами на ручке | | состояние удовлетворительное | |
| 9. | 50 | Столовая ложка с узорами на ручке | | состояние удовлетворительное | |
| 10. | 51 | Столовая ложка с узорами на ручке | | состояние удовлетворительное | |
| 11. | 52 | Вилка | | состояние удовлетворительное | |
| 12. | 53 | Вилка | | состояние удовлетворительное | |
| 13. | 54 | Чайная ложка, на ручке ложки присутствуют буквы "КУ". | | состояние удовлетворительное | |
| 14. | 55 | Чайная ложка, на ручке ложки присутствуют буквы "КУ". | | состояние удовлетворительное | |
| 15. | 56 | Глиняный ковшик коричневого цвета, внутри бежевый | | состояние удовлетворительное, | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | трещина склеена | |
| 16. | 57 | Горшок черного цвета, использовался для приготовления пищи | | состояние удовлетворительное | |
| 17. | 58 | Шкатулка черного цвета с откидной крышкой | | состояние удовлетворительное, замок сломан | |
| 18. | 59 | Очки, оправа выполенена из пластмассы коричневого цвета, дужки металлические. Принадлежали Павлу Адамовичу Богдановичу | | состояние удовлетворительное | |
| 19. | 60 | Очки, оправа выполнена из пластмассы коричневого цвета | | состояние удовлетворительное | |
| 20. | 61 | Кожаные ремни от портупеи коричневого цвета, принадлежали Льву Адамовичу Богдановичу. | [1914-1918] | состояние удовлетворительное | |
| 21. | 62 | Увеличительное стекло в металлической оправе, принадлежало Павлу Адамовичу Богдановичу. | | оправа не закреплена, стекло выщерблено | |
| 22. | 63 | Деревянная курительная трубка коричневого цвета, принадлежала Льву Адамовичу Богдановичу | | состояние удовлетворительное | |
| 23. | 64 | Носовой платок белого цвета с вышитым красными нитками вензелем "ЛБ" | | состояние удовлетворительное | |
| 24. | 65 | Офицерский темляк, принадлежащий Льву Адамовичу Богдановичу | [1914-1918] | состояние удовлетворительное | |
| 25. | 66 | Пуля "Дум-дум", которой был ранен Лев Адамович Богданович | [1914-1918] | состояние удовлетворительное | |
| 26. | 67 | Медаль "Преуспевающему. 1812-1912", вручена Льву Адамовичу Богдановичу по окончанию гимназии. На лицевой - два профиля (один - Николая II), на оборотной стороне надпись "Преуспевающему. 1812-1912". Упакована в коробку с застёжкой | 1912 г. | состояние удовлетворительное 4,2 см. | |
| 27. | 68 | Фотопортрет Л.А. Богдановича в военной форме в рамке с металлической подставкой, под стеклом; упакован в шкатулку зеленого цвета с застежкой | [1914-1918] | состояние удовлетворительное фото 10 х 7,8 см.; шкатулка 16 х 13,2 х 3,3 см. | |
| 28. | 69 | Медаль "За доблестный труд в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг.", выданная Павлу Адамовичу Богдановичу | 6.06. 1945 г. | состояние удовлетворительное 32 мм. | |
| 29. | 70 | Медаль "За трудовую доблесть" №41001 | | состояние удовлетворительное, формы правильного круга диаметром 34 | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | мм. | |
| 30. | 71 | Знак "Отличник соцсоревнования. Наркомхимпром" №195, упакован в футляр красного цвета, был выдан Павлу Адамовичу Богдановичу | | состояние удовлетворительное | |
| 31. | 72 | Значок "Отличник соцсоревнования. Наркомрезинпром" № 1649, был выдан Павлу Адамовичу Богдановичу | | состояние удовлетворительное | |
| 32. | 73 | Значок "Отличник соцсоревнования. Минхимпром" № 2249, был выдан Павлу Адамовичу Богдановичу | | состояние удовлетворительное | |
| 33. | 74 | Кожаное портмоне коричневого цвета, принадлежало Адаму Егоровичу Богдановичу | | состояние удовлетворительное 27 х 16 см. | |
| 34. | 75 | Запонки круглой формы с изображением скрещённых молотов (2 штуки), на оборотной стороне надпись "MARQUE DEPOSEE". Принадлежали Льву Адамовичу Богдановичу | | состояние удовлетворительное | |
| 35. | 76 | Металлическая коробка для чая с откидной крышкой и замком | | сломан замок 14 х 9 х 13 см. | |
| 36. | 77 | Сосуд для молока белого цвета с рисунком слив на боку и желтой перламутровой полоской на горлышке | | разбит на несколько частей | |

Итого в перечень включено 36 (тридцать шесть) музейных предметов с №42 по №77 .

Пералік склала
архівіст 2 катэгорыі
30.06.2011 г. — А.С.Сцепаненка

Загадчык аддзела забеспячэння
захоўвання дакументаў
30.06.2011 г. — В. І. Бярэйшык

Адказны за захаванне
музейнага фонда
30.06.2011 г. — А.С.Сцепаненка

18

У ДАДЗЕНЫМ ВОПІСЕ

ПРАШЫТА І ПРАНУМАРАВАНА

17 (семнаццаць) ЛІСТОЎ

арх. 2 кат. — пасада

[signature] — подпіс

А. Сушчынская — расшыфроўка

30.06.2011 — дата